БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

22 снежня 2008 года, № 21 (1993)




## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ПРАФСАЮЗ У СВЯТАХ І БУДНЯХ**
Пра асноўныя кірункі дзейнасці распавядае старшыня прафкама Яўген ТУРОМША
Стар. 2

**У АВАНГАРДЗЕ НОВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ**
50 гадоў Цэнтру інфармацыйных тэхналогій БДУ
Стар. 3

**ПРЫГОЖАЕ АБЛІЧЧА АЛЬМА-МАТЭР**
Пра шоу-конкурс "Міс БДУ-2008"
Стар. 4

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## ПЕРАМОЖНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

**Упершыню ў нашай краіне 24 лістапада ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры IBB адбыўся нацыянальны фінал Global Management Challenge-Belarus (GMC), перамогу ў якім святкавала каманда магістратуры эканамічнага факультэта БДУ "Новая Ініцыятыва".**

GMC – найбольш буйное ў свеце спаборніцтва па стратэгічным кіраванні кампаніяй для менеджэраў сярэдняга і вышэйшага звяна. Яно было заснавана ў Партугаліі ў 1980 г. і цяпер праводзіцца ў 30 краінах свету, штогод прываблiваючы больш за 20 тыс. удзельнікаў. Мадэль фірмы ў спаборніцтве ў значнай ступені адпавядае рэальнаму бізнэсу, а рашэнні, якія прымаюцца камандамі, уплываюць на становішча на рынку ў цэлым.

Сэнс праекта ў тым, што каманда кіруе віртуальнай кампаніяй. Эфектыўнасць яе рашэнняў ацэньвае спецыяльная кампутарная праграма. Бізнэс-стымулятар дае ўдзельнікам магчымасць распрацаваць і апрабаваць стратэгіі вываду на рынкі СНД, ЕС і інтэрнэту сваёй прадукцыі. Ад каманды патрабуецца прыняцце больш за 60 кіраўнічых рашэнняў за тыдзень – прыблізна адзін квартал працы віртуальнай кампаніі.

Спаборніцтва праходзіла ў тры этапы, два з якіх былі дыстанцыйныя (май-чэрвень, верасень-кастрычнік) і занялі па пяць тыдняў. Апошнім і самым складаным этапам стаў вочны фінал, у які выйшлі 8 найлепшых камандаў, што перамаглі ў сваіх падгрупах: "Гродна-Азот", "Гомель-Ліфт", "Атлант-М Сухарава", "МПОВТ", "HeadMade Marketing", каманды "Victory Style", "MAASS" ІБМТ БДУ і каманда магістратуры эканамічнага факультэта БДУ "Новая Ініцыятыва".


Каманда "Новая Ініцыятыва" разам з каардынатарам GMC-Belarus Ірынай Лаўрухінай і дэканам эканамічнага факультэта БДУ Міхаілам Кавалёвым (у цэнтры)

На гэтай стадыі бізнэс-стымулятар GMC змадэляваў сітуацыю, блізкую да рэальнасці: кампаніям давялося канкурыраваць не толькі паміж сабой – яны адчулі вострую канкурэнцыю з боку фірмаў азіяцкага рэгіёну, а таксама наступствы амерыканскага іпатэчнага крызісу, ваганні курсаў валют і коштаў на нафту. У фінале менеджэрам прыйшлося распрацоўваць стратэгію кіравання ў жорсткіх часавых рамках, якія скараціліся з аднаго тыдня, як гэта было ў адборачных турах, да адной гадзіны. Канкурэнцыя была сур'ёзнай, усе каманды паказалі агромністае жаданне перамагчы і высокі прафесіяналізм.

У выніку пераможцам GMC-Беларусь-2008 стала "Новая Ініцыятыва" (Аляксандр Шашко (капітан), Дзмітрый Бядок, Паліна Крывалапава, Цімафей Кузьмініч і Валерый Румас), якая атрымала права змагацца за званне найлепшай каманды свету на міжнародным фінале GMC у Лісабоне ў красавіку 2009 г. Другое месца заняла каманда "Атлант-М Сухарава". Трэцяе месца заваявала "HeadMade Marketing".

Беларускіх менеджэраў павіншаваў віцэ-прэзідэнт GMC Педра Алвес Коста, які прыехаў на фінал GMC-Беларусь з Партугаліі. Ён адзначыў, што праект паспяхова развіваецца ў нашай краіне, а яго арганізацыя адпавядае міжнародным стандартам. Дыпломы пераможцам уручыў генеральны дырэктар РУП "Белтэлекам", афіцыйнага партнёра гэтага спаборніцтва, Канстанцін Цікар.

**Аляксандр ШАШКО, капітан каманды**

## ТРЫМАЕМ МАРКУ

***Каманда БДУ ў складзе студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Філіпа Проніна (III курс), Дзмітрыя Рудоля і Сяргея Ціхана (абодва – II курс) адзіная з беларускіх прабілася ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні.***

У паўфінальных спаборніцтвах Паўночна-Усходняга еўрапейскага рэгіёну, якія адбыліся з 25 па 27 лістапада ў Санкт-Пецярбургу, прынялі ўдзел больш за 200 камандаў ВНУ, якія прадстаўлялі ўсе рэгіёны Расіі, Украіну, Казахстан, Кіргізію, Арменію, Узбекістан, Грузію, Латвію і Літву. Ад Беларусі выступалі дзве каманды з БДУІР, па адной – Гомельскага і Гродзенскага дзяржаўных універсітэтаў, а таксама чатыры каманды БДУ, дзве з якіх вырашылі 8 з 11 прапанаваных задач. Аднак па правілах толькі адна каманда ад ВНУ мае права на ўдзел у фінальных спаборніцтвах. Прычым, пераможцы паўфіналу, студэнты Саратаўскага дзяржаўнага універсітэта, вырашылі ўсяго на адну задачу больш, што красамоўна ілюструе складанасць і напал барацьбы. Фінал чэмпіянату свету па праграмаванні адбудзецца ў красавіку 2009 года ў Стакгольме (Швецыя). Пазмагаюцца тут 100 найлепшых студэнцкіх камандаў.

**Аляксандр КРАСЬКО**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПАСЯДЖЭННЕ Савета дырэктараў прадпрыемстваў БДУ адбылося 4 снежня з удзелам рэктара С. У. Абламейкі. Былі абмеркаваны пытанні, звязаныя з аптымізацыяй дзейнасці прадпрыемстваў БДУ, акрэслены мэты і задачы на 2009 г.

РЭКАНСТРУКЦЫЯ 2-й чаргі галоўнага корпуса БДУ пачнецца 1 верасня 2009г. На гэта выдзелены сродкі ў дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме. Распрацаваны план мерапрыемстваў па паступовым адсяленні адпаведных структур універсітэта.

ДЗЯРЖАЎНАЯ атэстацыйная камісія працуе ў БДУ з 15 да 24 снежня. Яна месціцца ў будынку юрыдычнага факультэта.

РЭСПУБЛІКАНСКІ інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ прызнаны лідарам сярод адпаведных устаноў, якія дзейнічаюць у краінах СНД. Такая ацэнка выказана на сустрэчы намесніка дырэктара РІК БДУ прафесара Ігара Малевіча з кіраўніцтвам Дзяржаўнай канцылярыі па вывучэнні кітайскай мовы за мяжой. Сустрэча адбылася падчас Сусветнага форуму кіраўнікоў інстытутаў кітаязнаўства імя Канфуцыя, які адбыўся 9–10 снежня ў Пекіне.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА

Выкананне праграм перспектыўнага развіцця БДУ на факультэце міжнародных адносін будзе разгледжана 12 студзеня. З дакладам выступіць дэкан ФМА Віктар Шадурскі. Пачатак мерапрыемства ў 10.15 у Зале пасяджэнняў Вучонага савета.

У ПРАФКАМЕ

# ПРАФСАЮЗ У СВЯТАХ І БУДНЯХ

***Прафсаюзная арганізацыя супрацоўнікаў БДУ — самая буйная ў галіне адукацыі. Яна налічвае ажно 6 300 членаў. Зразумела, што клапаціцца пра інтарэсы такой колькасці працаўнікоў, — нялёгкая задача. Пра шматаспектную дзейнасць прафкама распавёў яго шматгадовы старшыня Яўген ТУРОМША.***

*— Прафсаюз заўсёды дбаў пра дабрабыт сваіх членаў, ставіў пытанні павышэння заробку і своечасовай яго выплаты. Што робіцца зараз?*

— Забеспячэнне занятасці супрацоўнікаў нашай ВНУ, узровень аплаты іх працы, вырашэнне працоўных і прафесійных праблем гарантуецца артыкуламі Калектыўнага дагавора на 2007–2010 гг. Ён заключаецца паміж працоўным калектывам БДУ, які прадстаўляе прафкам, і адміністрацыяй у асобе рэктара. Шматлікія праблемы вырашаюцца сумесна на прынцыпах сацыяльнага партнёрства.

Абодва бакі пастаянна стараюцца павышаць у выкладчыкаў матэрыяльную зацікаўленасць у выніках сваёй працы. Мяркуйце самі, сярэдняя заработная плата супрацоўнікаў БДУ ў студзені-верасні 2008 г. склала 990 тыс. руб., а прафесарска-выкладчыцкага складу 1 375 тыс. руб. Для параўнання, у 2007 г. сярэдні заробак ПВС быў 1млн 77 тыс. руб. Як бачым, павелічэнне значнае. У дадатак да Калектыўнага дагавора мы распрацавалі Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні працы супрацоўнікаў універсітэта, а таксама Палажэнне аб парадку выкарыстання фонду матэрыяльнай дапамогі. Згодна з апошнім дакументам, дапамога аказваецца ў наступных выпадках: заключэнне шлюбу, нараджэнне дзіцяці, смерць члена сям'і; а таксама шматдзетным сем'ям, падчас працяглай хваробы і г. д. Да ўсяго, прынята рашэнне аказваць матэрыяльную дапамогу ў памеры 30 базавых велічынь (а гэта 1 млн 50 тыс. руб. у год), калегам, дзеці якіх вучацца ў нашым універсітэце на платнай аснове. Праўда, пры гэтым мы паставілі ўмову, што стаж супрацоўніка павінен быць не меней за 5 гадоў, а калі працуюць і муж і жонка, то не меней, чым 3 гады.

Дадаткова прафкам аказвае супрацоўнікам матэрыяльную дапамогу ў складаных абставінах. На гэта выдаткоўваецца амаль 30 % яго бюджэту – каля 130 млн руб.

*– Самай вострай з'яўляецца праблема паляпшэння жыллёвых умоў супрацоўнікаў БДУ. Ці ёсць якія-небудзь зрухі ў гэтым кірунку?*

– На сёння чарга супрацоўнікаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, складае больш за 600 чалавек. Сярод іх – 420 чалавек з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу (172 маюць вучоныя ступені і званні). Як бачым, лічба немалая.

Рэктарат і прафсаюзны камітэт БДУ звярнуліся ў Адміністрацыю прэзідэнта краіны з просьбай дапамагчы вырашыць жыллёвую праблему. Пры гэтым было даведзена, што большая частка тых, каму трэба паляпшаць жыллёвыя ўмовы, з'яўляюцца маладымі выкладчыкамі і вучонымі і пражываюць на арандаваных кватэрах і ў інтэрнаце. Пасля нашага звароту кіраўнік дзяржавы даў даручэнне аб будаўніцтве жылога дома для прафесарска-выкладчыцкага складу і навуковых работнікаў універсітэта (Пратакол № 8 ад 10.03.2008 г.).

Зараз упраўленне капітальнага будаўніцтва Маскоўскага раёна сталіцы займаецца архітэктурна-планіровачнай распрацоўкай 70-кватэрнага дома па вуліцы Бялецкага.

Да ўсяго, БДУ сумесна з БРСМ Першамайскага раёна Мінска вырашылі стварыць моладзевы жыллёва-будаўнічы кааператыў і звярнуліся да гарадскіх улад з просьбай выдзеліць пляцоўку для будаўніцтва яшчэ аднаго дома.

*– Нельга абмінуць клопаты пра здароўе працаўнікоў. Як вы арганізуеце іх адпачынак?*

– Пуцёўкі ў санаторый для работнікаў БДУ мы атрымліваем у Цэнтры па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Маскоўскага раёна Мінска. Яны прыпадаюць у большасці на зімні перыяд.

У 2007 г. мы атрымалі 109 пуцёвак у санаторый. У 2008 г. – столькі ж. Але расклад быў крыху іншым: толькі 16 пуцёвак – для дарослых, 61 – для дзяцей, 12 – у санаторый "Маці і дзіця", 20 – у Мінскую гразевую лячэбніцу. Трэба дадаць, што сёння, каб атрымаць права на санаторна-курортнае лячэнне, трэба абавязкова мець даведку ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі з паліклінікі аб стане здароўя. Кошт пуцёўкі разлічваецца шляхам параўнання сярэдняга гадавога заробку працаўніка з сярэднім заробкам па краіне ў цэлым.

Зразумела, што для нашага вялікага калектыву такая колькасць пуцёвак недастатковая. Прычым апошнія два гады да нас не паступаюць санаторныя пуцёўкі на летні перыяд. З прычыны таго, што гэта якраз і ёсць найбольш спрыяльны час адпачынку для нашых выкладчыкаў, то, натуральна, мае месца незадавальненне.


Яўген Туромша (крайні злева) са сваім намеснікам Аляксандрам Нікіценкам, галоўным спецыялістам Валянцінай Лукавіцкай і галоўным бухгалтарам Галінай Скальскай-Гушчынай

Выратоўвае ўласная база універсітэта – САК "Брыганціна", дзе арганізуецца адпачынак супрацоўнікаў і членаў іх сем'яў улетку. У 2007 г. тут пабывалі 420 супрацоўнікаў БДУ з сем'ямі, у 2008 г. – 472. Гэта практычна максімальная колькасць людзей, якую мы ў стане аздаравіць. Для таго, каб развіваць аздараўленчую базу надалей, наспела патрэба ў капітальным рамонце 1-га корпуса САК.

Яшчэ адна форма актыўнага адпачынку – гэта ўдзел у фізкультурна-аздараўленчым жыцці нашага універсітэта. Штогод сярод супрацоўнікаў БДУ праводзяцца "Дні здароўя" і спартакіяда "Здароўе". Дзякуючы наяўнасці цудоўнага спартыўнага комплексу па вуліцы Кастрычніцкай і іншых спартыўных збудаванняў, у нас на пастаяннай аснове працуюць 20 груп "Здароўе", якія наведваюць да 700 чалавек. Трэба дадаць, што прафкам аплочвае работу выкладчыкаў кафедры фізвыхавання і спорту, якія вядуць заняткі ў такіх групах. Будзе добра, калі ўсе скарыстаюць гэтую магчымасць палепшыць здароўе, бо заняткі фізкультурай і спортам нашмат карыснейшыя, чым тэрапія з дапамогай лекаў.

*– Істотна дапаўняе работу прафкама ў сацыяльнай сферы і культурна-масавая работа. Што сюды ўваходзіць?*

– Правядзенне шматлікіх святочных мерапрыемстваў, экскурсійныя паездкі, падтрымка творчых калектываў. Кожны год прафкам сумесна з Саюзам жанчын БДУ ладзіць сустрэчы са шматдзетнымі маці, якім дорыць падарункі.

Зараз мы занятыя падрыхтоўкай да Новага года. 6 студзеня 2009 г. прафсаюз арганізуе два святочныя ранішнікі і дыскатэку для дзяцей нашых супрацоўнікаў. Супрацоўнікі БДУ, як заўсёды, атрымаюць ад рэктарата і прафсаюзнага камітэта падарункі для сваіх дзяцей (да 14-гадовага ўзросту). А гэта каля 2 500 падарункаў на 30 млн руб. Наш універсітэт, бадай, адзіны сярод ВНУ, які гатовы ісці на такія выдаткі, каб парадаваць на святы калектыў. Таксама мы матэрыяльна дапамагаем факультэтам ладзіць святочныя навагоднія вечарыны.

У прафкаме заўсёды рады, калі ў нашых калег знаходзяцца таленты і жаданне іх прадэманстраваць. Мы фінансуем два творчыя калектывы: народны хор выкладчыкаў і супрацоўнікаў "Родніца" і дзіцячы ансамбль "Літарынка".

Увогуле, у нас вельмі добра працуе культурна-масавая камісія. Ёю зладжаны шэраг экскурсій па гісторыка-архітэктурных і экалагічна-біясферных запаведных месцах. Выкладчыкі універсітэта наведаліся ў Нясвіж, Полацк, Віцебск, Пінск, Тураў, Навагрудак, Жыровічы, а таксама на Блакітныя азёры, Нарач, у Бярэзінскі запаведнік, Пінскі экалагічны заказнік і іншыя мясціны. Напярэдадні Новага года нашых вандроўнікаў запрашае ў Паставы на сваю страусіную ферму знакаміты Зюзя Паазерскі.

Гэта толькі невялікі пералік усяго таго, чым займаецца прафсаюз. Мы заўсёды гатовы выслухаць тых, хто прыходзіць да нас са сваімі турботамі і клопатамі, нешта параіць, дапамагчы.

**Ганна ЛАГУН**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

СВЯТЫ

## Праваслаўная кніга

**Фундаментальная бібліятэка БДУ 10 снежня зладзіла выставу, прысвечаную 1020-годдзю Хрышчэння Русі.**

"Развіццё хрысціянства і кнігі непарыўна звязаны. Яна атрымала шырокае распаўсюджанне менавіта дзякуючы Хрышчэнню Русі", – зазначыла падчас адкрыцця Людміла Янковіч, загадчыца аддзела гуманітарна-асветніцкай работы ФБ. На яе думку, сімвалічна, што першай кнігай, надрукаванай на кірыліцы нашым суайчыннікам Францыскам Скарынам, стала Біблія.

Усяго на выставе было прадстаўлена болей за 120 кніг, якія можна з гонарам назваць духоўным скарбам нашага універсітэта. У раздзеле "Напачатку было слова..." знаходзіліся манаграфіі і вучэбныя дапаможнікі, у якіх раскрываецца сутнасць рэлігіі, паходжанне, станаўленне і пашырэнне праваслаўя на ўсходнеславянскіх землях. Раздзел "Словам і жыццём настаўляючы" распавёў пра пастырскае служэнне вядомых духоўных асоб, падзвіжнікаў, якія адыгралі важную ролю ў гісторыі царквы і дзяржавы: мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта, а таксама святых Іаана Кранштацкага, цудатворцу Серафіма Сароўскага, Еўфрасінню Полацкую і іншых асоб.



Найбольш каштоўныя і рэдкія кнігі апынуліся ў "Хрысціянскіх рарытэтах".

Літаратуру пра манастыры, цэрквы, іконы і свяшчэнныя рэліквіі можна было адшукаць у "Праваслаўных святынях". У раздзел "У свеце хрысціянскіх ідэалаў" патрапілі кнігі, якія сталі сведчаннем дабратворнага ўздзеяння веры на духоўную культуру.

Па словах Людмілы Янковіч, выстава хрысціянскіх кніг арганізоўвалася ўпершыню, і да яе падрыхтоўкі аднесліся з энтузіязмам. Да гэтай працы спрычынілася і ўпраўленне па справах культуры, што запрасіла віяланчалістаў, якія гралі духоўную музыку. Чаканым госцем на выставе стаў свяшчэннік, айцец Кірыл (Шчолкаў).

**Ганна ЛАГУН**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## "МОВА І СОЦЫУМ"

**210 навукоўцаў-лінгвістаў з 12 краін свету сталі ўдзельнікамі VIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Мова і соцыум", якая прайшла 5-6 снежня на філалагічным факультэце БДУ.**

Сёлетняе мерапрыемства прымеркавана да *20-годдзя кафедры прыкладной лінгвістыкі*. Яно прайшло пад эгідай Міжнароднай асацыяцыі выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры, якая ўключае больш за 90 краін, і пры падтрымцы Міністэрства адукацыі нашай краіны, а таксама Беларускага грамадскага аб'яднання выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры.

У цэнтры ўвагі даследчыкаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Літвы, Польшчы, Кітая, ЗША і іншых краін сталі пытанні суадносінаў мовы з соцыумам і культурай, праблемы моўнай сітуацыі і палітыкі, білінгвізму, аналіз мовы СМІ і метадалогіі даследавання палітычнага дыскурсу.

Гэты форум праводзіцца з 1992 года і заўжды прыцягвае вялікую ўвагу навукоўцаў блізкага і далёкага замежжа. Шырокі рэзананс маюць і зборнікі з матэрыяламі канферэнцый.

## СУПРУНОЎСКІЯ ЧЫТАННІ

**На філалагічным факультэце 5–6 снежня адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянскія мовы: аспекты даследавання" (VI Супруноўскія чытанні)**, прысвечаная 80-годдзю вядомага беларускага лінгвіста, заснавальніка кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства прафесара Адама Супруна.

Адкрыў канферэнцыю рэктар БДУ прафесар Сяргей Абламейка. З прывітальным словам да ўдзельнікаў звярнуўся Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны ў Беларусі Ігар Ліхавы. На пленарным пасяджэнні з дакладам "А. Я. Супрун – вучоны і педагог" выступіў дэкан філалагічнага факультэта прафесар Іван Роўда.

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел славісты з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Балгарыі, Германіі і Аўстрыі. Навукоўцы абмеркавалі тэндэнцыі развіцця славістыкі ў сучасным свеце і вызначылі планы далейшага міжнароднага супрацоўніцтва ў гэтай галіне навукі.

АБ'ЯВЫ

**ДУА "ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛЫ" БДУ**
**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне пасад:**

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння па спецыяльнасці "Свяшчэннае Пісанне Старога і Новага Запавету" (0,5 стаўкі) і па спецыяльнасці "Багаслоўе" (0,5 стаўкі); філасофска-хрысціянскай антрапалогіі па спецыяльнасці "Параўнальнае і асноўнае багаслоўе" (0,5 стаўкі); рэлігіязнаўства (0,5 стаўкі).

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 24, тэл.: 220-23-55.*

**ДУА "ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ" БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА**
**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне пасад:**

ВЫКЛАДЧЫКА кафедры нацыянальнай культуры і турызму – 1;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – 2.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, п. 31, тэл.: 209-59-71.*

УРАЧЫСТАСЦІ

# У АВАНГАРДЗЕ НОВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

***Цэнтр інфармацыйных тэхналогій Белдзяржуніверсітэта святкуе 50-годдзе. З гэтай нагоды 15 снежня ў Ліцэі адбылося ўрачыстае мерапрыемства, у якім бралі ўдзел супрацоўнікі ЦІТ, кіраўніцтва БДУ, а таксама прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў і Міністэрства адукацыі краіны.***

Слаўная гісторыя цяперашняга ЦІТ распачалася з загадам Міністэрства адукацыі СССР ад **4 лістапада 1958 г.** аб стварэнні ў БДУ Вылічальнага цэнтра ў складзе 4-х студэнтаў V курса фізічнага факультэта. Неўзабаве была набыта першая айчынная універсальная ЭВМ "Урал-1", а на матэматычным факультэце адкрылася новая спецыяльнасць "вылічальная матэматыка". У 1960 г. пачалося выкарыстанне ЭВМ у навучальным працэсе і ў навуковых даследаваннях.

У 1977 г. распрацаваная ў ВЦ БДУ сістэма ўводу алгарытмаў рашэння задач апрацоўкі даных з аддаленага тэрмінала была ўзнагароджана двума бронзавымі медалямі ВДНГ СССР. У 1978–1985 гг. выконваўся шэраг гаспадарчых дамоў з укараненнем вынікаў праграмных распрацовак у вытворчасць: для завода аўтаматычных ліній г. Мінска; для Генштаба Узброеных Сіл СССР і інш. У 1984 г. завершана распрацоўка аўтаматызаваных сістэм "Абітурыент" і "Кадры" на аснове новых тэхналогій – баз даных і сістэм віртуальных машын.

**1991 г.** – пачатак развіцця інфармацыйнай сеткі БДУ. На факультэце радыёфізікі і электронікі ўсталяваны першы сеткавы кампутарны клас. 25 лютага 1994 г. загадам рэктара БДУ ВЦ рэарганізаваны ў Інфармацыйна-вылічальны цэнтр (ІВЦ). Забяспечаны доступ карыстальнікаў сеткі БДУ да электроннай пошты з дапамогай знешняга канала на хуткасці 2,5 Кбіт/с. У 1996 г. сетка БДУ атрымала доступ у Internet на хуткасці 14 Кбіт/с. Пачалося праектаванне і будаўніцтва апорнай оптавалаконнай сеткі БДУ. 3 чэрвеня 1997 г. ІВЦ пераўтвораны ў Цэнтр інфармацыйных тэхналогій (ЦІТ). У 1999–2001 гг. ствараецца апорная магістраль навуковай кампутарнай сеткі краіны. У 2003 г. наладжваюцца інфармацыйныя сеткі студэнцкіх інтэрнатаў. З 2004 г. ЦІТ задзейнічаны ў выкананні праграмы па ўдасканаленні арганізацыі самастойнай работы студэнтаў; на факультэтах вядзецца масавая распрацоўка электронных вучэбных матэрыялаў на агульнауніверсітэцкай сеткавай платформе e-University.

**На сёння** апорная оптавалаконная сетка БДУ аб'ядноўвае 29 корпусаў. Да яе падключана каля 6 тысяч кампутараў і 1300 тэлефонных абанентаў. Колькасць карыстальнікаў перавышае 20 тысяч. Знешнія каналы: 1 Гбіт/с у Навукова-інфармацыйную кампутарную сетку Рэспублікі Беларусь і 15 Мбіт/с – у Internet.

**3 снежня 2008 г.** адбылася сустрэча рэктара БДУ прафесара Сяргея Абламейкі з кіраўніцтвам ЦІТ і Цэнтра інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый БДУ (ЦІРК), дзе аналізавалася дзейнасць гэтых структур універсітэта і былі вызначаны найбліжэйшыя задачы.



Кіраўніцтва ЦІТ (злева направа): Леанід Утко, Юрый Варатніцкі (дырэктар), Георгій Мазжухін і Віктар Плявака

Па словах дырэктара ЦІТ Юрыя Варатніцкага, да такіх задач, па-першае, адносіцца *стварэнне новай сістэмы інтэрнэт-рэсурсаў БДУ* (гэта перш за ўсё абноўлены сайт універсітэта, а таксама інтэрнэт-сайты факультэтаў і асноўных падраздзяленняў), якая найбольш поўна задаволіць інфармацыйныя патрэбы самай шырокай інтэрнэт-аўдыторыі ў Беларусі і за мяжой. У выніку універсітэт будзе прадстаўлены ў Internet як еўрапейская вышэйшая навучальная ўстанова, у якой на высокім узроўні вядуцца навуковыя даследаванні і прапануецца якасная адукацыя. У перспектыве інтэрнэт-рэсурсы БДУ павінны заняць годнае месца сярод сусветных адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў.

Па-другое, у БДУ існуе *аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма*, якая ўключае ў сябе цэлы шэраг падсістэм (кіраванне персаналам, адукацыйнымі рэсурсамі (e-University), навукова-даследчымі працамі і г.д.). Пакуль што гэта адзіная сістэма ў краіне, якая тыражуецца і прададзеная ў цэлы шэраг ВНУ. Але зараз неабходна пашырыць яе функцыянальныя магчымасці для таго, каб яна стала інфармацыйным ядром сістэмы менеджменту якасці, якая ствараецца ў БДУ.

Па-трэцяе, БДУ валодае адной з найбуйнейшых кампутарных адукацыйных сетак у краіне. Яе магчымасці дэманстраваліся ў лютым 2008 г. падчас тэлетрансляцыі ў сетцы БДУ выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі на факультэце журналістыкі. Гэтыя магчымасці неабходна развіваць. Гаворка ідзе пра стварэнне *сістэмы IP-тэлебачання*. Акрамя таго, у сетцы БДУ павінны стаць даступнымі відэаканферэнцыі, тэленавучанне, публічнае чытанне лекцый на адлегласці з інтэрактыўным узаемадзеяннем лектара і аўдыторыі.

**Падрыхтаваў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

АКЦЫІ

# СТОП – СНІД



***Штогод БРСМ БДУ далучаецца да акцыі "СТОП – СНІД" у рамках Сусветнай кампаніі супраць СНІДу і Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу.***

Дадзеная праблема шырока асвятляецца ў СМІ, пастаянна праводзяцца мерапрыемствы, скіраваныя на прадухіленне страшнага захворвання, аднак, на жаль, дагэтуль праблема СНІДу актуальная ў нашай краіне. На 1 верасня 2008 г. у Беларусі зарэгістравана 9282 ВІЧ-інфікаваныя. Пераважная іх большасць – гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў. Асноўны фактар заражэння – ін'екцыйнае ўвядзенне наркотыкаў і бязладныя палавыя сувязі. Для барацьбы з гэтым сацыяльна небяспечным захворваннем у краіне рэалізуецца Дзяржаўная праграма прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі на 2006–2010 гг.

Гэты дзень дае ўсім магчымасць засяродзіць увагу на праблеме сусветнага маштабу. Студэнты БРСМ БДУ кожны год імкнуцца прыдумаць штосьці запамінальнае, яркае, каб яшчэ раз нагадаць усім пра тое, што праблема ВІЧ/СНІД існуе і дагэтуль і што кожны можа ўсцерагчы сябе і сваіх блізкіх.

1 снежня актыў геаграфічнага факультэта БДУ сумесна са студэнтамі фізічнага факультэта правялі акцыю "Спыні СНІД. Выканай абяцанне". У яе межах быў праведзены конкурс плакатаў, хлопцы раздавалі прэзерватывы, чырвоныя стужачкі як знак датычнасці кожнага да дадзенай праблемы, хтосьці чытаў вершы, спяваў песні, дзяліўся меркаваннямі і ведамі. Нават невялікі ўнёсак кожнага – гэта частка адной вялікай і сацыяльна значнай справы.

А ты выканаў абяцанне?

**Юлія КРУК,**
**Дзмітрый ЛЕБЕДЗЬ**

ВЫСТАВЫ

# ЕЎРАПЕЙСКІ ВЕКТАР

**Дэлегацыя БДУ брала ўдзел у міжнароднай адукацыйнай выставе "Грэнцэнлос-2008 – адукацыя і праца за мяжой", якая праводзілася 19-20 лістапада Рурскім універсітэтам Бохума (ФРГ) – нашым даўнім партнёрам.**

На выставе дэманстраваліся больш за 40 арганізацый, у ліку якіх Ягелонскі універсітэт (г. Кракаў, Польшча), Вроцлаўскі універсітэт (Польшча), універсітэт Утрэхта (Нідэрланды), універсітэт імя Франсуа Рабле г. Тур і Рэймскі універсітэт г. Ардэн (Францыя), іспанскі універсітэт Ав'еда, універсітэты г. Кіёта і г. Цукуба (Японія), а таксама розныя фірмы, якія займаюцца наборам студэнтаў і садзейнічаюць іх выезду за мяжу на вучобу.

Наведвальнікі і замежныя ўдзельнікі выставы цікавіліся навучаннем у БДУ. Асаблівую ўвагу прыцягнула разнастайнасць прапанаваных моўных курсаў для іншаземцаў, а таксама магчымасці кароткатэрміновых навуковых і навучальных стажыровак у Белдзяржуніверсітэце.

Несумнеўна, удзел БДУ ў мерапрыемствах такога кшталту дазваляе не толькі прасоўваць адукацыйныя паслугі на міжнародны рынак, але і спрыяе ўмацаванню аўтарытэту вядучай навучальнай установы Беларусі ў свеце.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення міжнародных сувязяў**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# З ДУМАЮ ПРА БАЦЬКАЎШЧЫНУ

***Лаўрэатаў конкурсу эсэ "Суверэнная Беларусь: ад мары да рэальнасці (сучасныя праблемы і магчымыя кірункі развіцця)" ушаноўвалі 15 снежня на пасяджэнні Вучонага савета БДУ.***

Конкурс праходзіў з 15 верасня па 15 кастрычніка. Яго арганізатарамі выступілі Інфармацыйна-аналітычны цэнтр Адміністрацыі Прэзідэнта нашай краіны і Белдзяржуніверсітэт. Студэнты і аспіранты ў сваіх працах выказвалі сваё бачанне найбольш вострых праблем, якія стаяць перад краінай, а таксама кірункаў перспектыўнага развіцця Беларусі, прапанаваўшы свае варыянты рашэнняў.

Павіншаваў лаўрэатаў намеснік дырэктара ІАЦ Аляксей Гусеў. Аўтары найлепшых эсэ атрымалі грашовыя прэміі: 350 тыс. руб., 250 тыс. руб. і 150 тыс. руб. за 1-е, 2-е і 3-е месцы адпаведна, акрамя таго, па 100 тыс. руб. у якасці заахвочвальнага прыза.

*1-е месца:*

Артур ДЗЯНІСАЎ (ФФСН, 3 курс) "Праграма рэсацыялізацыі былых злачынцаў: ад тэорыі да практыкі" (пытанні крымінальна-папраўчай сістэмы);

Маргарыта ФАБРЫКАНТ (ФФСН, аспірантура) "Сучасная беларуская нацыянальная ідэнтычнасць як рэсурс для развіцця грамадзянскай адказнасці (самаідэнтыфікацыя)".

*2-е месца:*

Аксана ТУРОК (філалагічны факультэт, 4 курс) "Праблемы школьнай адукацыі ў Беларусі і спосабы іх вырашэння" (школьная адукацыя);

Раман ЖЫЛІЧ (ФПМІ, 3 курс) "Праблемы развіцця інфармацыйных тэхналогій у Беларусі";

Іван МАРОЗ (ФМА, 2 курс) "Нацыя і нацыянальная ідэя Рэспублікі Беларусь" (самаідэнтыфікацыя).

*3-е месца:*

Руслан АКУЛЕНКА (ФМА, 2 курс) "Энергетычная бяспека Рэспублікі Беларусь: асноўныя праблемы і шляхі іх вырашэння" (энергабяспека);

Марыя ЖАРЫЛОЎСКАЯ (юрыдычны факультэт, 2 курс) "Асноўныя кірункі забеспячэння суверэнітэту Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе";

Карына МІСЮКЕВІЧ (ФМА, 2 курс) "Развіццё воднага турызму ў Беларусі і шляхі яго паляпшэння" (турызм);

Максім ШЧАЦЬКО (юрыдычны факультэт, 2 курс) "Канцэптуальныя асновы захавання незалежнасці і забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь" (шырокая праблематыка).

Заахвочвальныя прызы: Наталля Барсукова і Лізавета Боскіна (абедзве – эканамічны факультэт, 1 курс), Мікіта Дунец (ФМА, 2 курс), Наталля Мыкуш, Арсеній Сівіцкі (ФФСН, 2 курс), Вераніка Штрэна (філалагічны факультэт, 1 курс).

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Інтэрв'ю з рэктарам БДУ прафесарам Сяргеем Абламейкам** – "Вечерний Минск" (26.11).

**"Міс БДУ"** – naviny.by (09.12); "Звязда" (10.12).

**Турнір юных матэматыкаў, арганізаваны БДУ і Міадукацыі,** – БелТА (07.12); "Рэспубліка" (06.12); "Звязда"/"Чырвоная змена" (12.12).

**Інтэрв'ю з загадчыкам кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ Людмілай Саянковай** – "Настаўніцкая газета" (06.12).

**Інтэрв'ю з прафесарам БДУ Вольгай Якушкай** – "Обозреватель" (05.12).

**Да юбілею прафесара БДУ Людмілы Сіньковай** – "Літаратура і мастацтва" (05.12).

**VIII Міжнародная навуковая канферэнцыя "Мова і соцыум"** – БелТА (04.12); БелаПАН (04.12); naviny.by (04.12); "Рэспубліка" (05.12).

**Дні адкрытых дзвярэй у БДУ** – "Народная газета" (02.12); tut.by (03.12); "Звязда"/"Чырвоная змена" (05.12).

**Семінар школы студэнцкага актыву** – БелТА (30.11).

**Каманда БДУ ў фінале чэмпіянату свету па праграмаванні** – БелТА (28.11); open.by (29.11); tut.by; "Рэспубліка" (02.12); "Вечерний Минск" (02.12); "Народная газета" (03.12); "Звязда"/"Чырвоная змена" (05.12).

**Пра выкладанне балгарыстыкі на кафедры тэарэтычнага і славянскага моваўнаства філфака БДУ** – "Літаратура і мастацтва" (28.11).

**Выязны семінар "Абітурыент-студэнт-журналіст" Інстытута журналістыкі БДУ ў Вілейцы** – "Настаўніцкая газета" (27.11); "Рэспубліка" (02.12); "Звязда" (09.12).

**Перамога каманды магістрантаў эканамічнага факультэта БДУ "Новая Ініцыятыва" ў першым нацыянальным фінале міжнароднага спаборніцтва для менеджэраў Global Management Challenge (GMC)** – БелТА (26.11).

**Павышэнне аплаты за навучанне** – БелаПАН (26.11); naviny.by (26.11); open.by (27.11); "Советская Белоруссия" (27.11).

**Першы фестываль нацыянальных культур паміж ВНУ, арганізаваны БДУ,** – "Звязда" (25.11); "Минский курьер" (26.11; 29.11).

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ПРЫГОЖАЕ АБЛІЧЧА АЛЬМА-МАТЭР

***Што ніколі не надакучыць? Вядома, сузіранне прыгожага. Менавіта для гэтага і сабраліся 8 снежня (у панядзелак!) гледачы ў канцэртнай зале "Мінск".***

"Міс БДУ-2008"... Пяць гадоў усе мы чакалі гэтай падзеі.

Дзявочы вобраз – магніт, які прыцягвае сваёй чысцінёй і душэўнасцю. Канкурсанткі сапраўды зачароўвалі: хацелася радавацца, пляскаць у далоні і проста суперажываць (як гэта было падчас прэзентацыі-"візітоўкі" Ірыны Грыгальчык).

За званне "Міс БДУ" змагаліся прадстаўніцы 16 факультэтаў і інстытутаў альма-матэр. Ім трэба было прайсці некалькі выпрабаванняў: "візітоўка", то бок паказ самой сябе; "дзелавы конкурс", які ўключаў дэманстрацыю дзелавога касцюма ад вядомага швейнага прадпрыемства "Нелва" і інтэрв'ю. А таксама дэфіле ў туніцы ("дзяўчына ў туніцы" – сімвал "Міс БДУ") і вячэрнім строі; творчы конкурс, у якім трэба было паказаць свае таленты ў любым жанры на выбар: вакальным, танцавальным, музычным, літаратурным і г. д.



Міс БДУ-2008 Ірына Грыгальчык

А зараз пра нашых канкурсантак.

№ 1 падарыў ёй поспех, які не пераходзіў у гэты вечар ні да адной з удзельніц. Ірына Грыгальчык з эканамічнага факультэта падчас першага конкурсу з'явілася ў вобразе дзяўчыны, якую спакушае нячысцік. Але яна застаецца на шляху чысціні і бязгрэшнасці. З цягам часу яна змяніла доўгую сукенку да пят на экстрэмальна кароткую блiскучую сукеначку і выканала песню ў стылі "дыска".

Надзвычай запомнілася "візітоўка" Дар'і Шык (механіка-матэматычны факультэт). Шык-бляск! Інакш не скажаш. Двума кантрольнымі стрэламі вачэй яна на сцэне забіла міліцыянера! Не меней эпатажным быў і яе творчы нумар, падчас якога яна ў вобразе маці з немаўляткам бегала па хаце раніцай у нядзелю і шукала ключы... Цікавы сюжэт, аздоблены матывамі фемінізму, выдатнага акцёрскага майстэрства і ўпрыгожаны самымі лепшымі ножкамі на гэтым конкурсе, сапраўды заслужыў апладысменты залы.

А прадстаўніца Інстытута журналістыкі Аксана Ліцкевіч па прафесійнай звычцы вырашыла асвятліць гэтае мерапрыемства, але не так, як гэта прынята ў акул пяра, а... сваёй усмешкай.

Паралельна з выступленнямі дзяўчат вядучы мерапрыемства Сяргей Дарафееў спрабаваў перадаць ім часцінку свайго майстэрства і старанна навучаў канкурсантак тэхніцы маўлення. На сцэне выступілі неператузыдзены Алег Усаў (так, той хлопец, які танчыць, як Майкл Джэксан), групы "Da Vinci" і "Чук і Гек", Антон Мартынаў і нават шоу культурыстаў.

Было весела, камерна (нягледзячы на тое, што зала вялікая, адчувалася яднанне ўсіх прысутных). Адзін з членаў журы Георгій Калдун лічыць, што найбольш удалым атрымаўся ў дзяўчат творчы конкурс, дзе вельмі важна, каб прыгажосць гарманіравала з душой. Усім жа ўдзельніцам мерапрыемства ён параіў не думаць пра месца, якое могуць заняць, а проста атрымліваць задавальненне.

У выніку карона разам з падарожжам па Еўропе (вось такая ўзнагарода ад арганізатараў!) дасталася Ірыне Грыгальчык, а віцэ-міс стала Ірына Волкава з Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій.

Разам з тым відавочна, што канкурсанткі ўвабралі не ўсю прыгажосць. Многія студэнткі альма-матэр вартыя, каб выйсці на сцэну. Толькі сваю карону яны і так з годнасцю носяць, не патрабуючы публічнага прызнання...

*Даведка*
*Конкурс "Міс БДУ" праводзіцца з 1994 года і з таго часу некалькі разоў мяняў назву. Спачатку ён зваўся "Міс Юніверсіці", потым – "Панна Адукацыя", з 2008 года – "Міс БДУ".*

**Лейла ІСМАІЛАВА**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# МАЦУЕМ СЯБРОЎСТВА

***Гала-канцэрт першага Міжвузаўскага фестывалю нацыянальных культур з удзелам прадстаўнікоў 10 краін свету адбыўся 26 лістапада ў Ліцэі БДУ. Арганізатар гэтага яскравага мерапрыемства – Студгарадок БДУ.***



Студэнты з васьмі сталічных ВНУ, якія выйшлі ў фінал па выніках адборачнага тура, у песні, танцы (асноўных жанрах выступленняў) пастараліся расказаць гледачам пра асаблівасці культуры, традыцыі сваёй краіны.

Дзякуючы таленавітым самадзейным артыстам гледачы і ўдзельнікі канцэрта здзейснілі дзівоснае падарожжа ў Арменію, Турцыю, Кітай, Азербайджан, Іран, В'етнам, Бельгію, Грузію, Нігерыю і вярнуліся ў Беларусь. Асабліва цікава было паглядзець на інтэрнацыянальныя творчыя нумары.

Канцэрт ушанавалі сваёй прысутнасцю пасланцы краін-удзельніц мерапрыемства.

Ідэяй фестывалю было развіццё полікультурнай адукацыі ў ВНУ нашай краіны, фарміраванне талерантнага стаўлення да поглядаў, перакананняў, духоўных і эстэтычных каштоўнасцяў прадстаўнікоў розных народаў, папулярызацыя беларускай культуры сярод студэнтаў іншых нацыянальнасцяў.

**Юлія ХМЯЛЕЎСКАЯ**

## КОНКУРСЫ

# КАНКУРЭНТЫ НЕ СТРАШНЫЯ

***Дзе яшчэ ў адным месцы можна сустрэць столькі заўзятых жартаўнікоў, як не на розыгрышы "Кубка КВЗ". 4 снежня вырашылася, якая з камандаў інтэрнатаў Студэнцкага гарадка БДУ будзе насіць званне самой вясёлай і знаходлівай увесь наступны год.***


Пераможцы кубка КВЗ "Барада Чак Норыса"

Пяць калектываў, сярод якіх і чатырохразовы ўладальнік кубка – каманда КВЗ з "шасцёркі" – дэманстравалі свае здольнасці і кураж у традыцыйных конкурсах: "Прывітанне", "Размінка" і "Музычнае прывітанне" – усё, як у Вялікай гульні. І тут хлопцы і дзяўчаты пастараліся, зала смяялася ўвесь вечар.

Ацэньвалі выступленні прадстаўнікі адміністрацыі універсітэта Руслан Папок (Псіхалагічная служба) і Людміла Хухлындзіна (ГУВНМР) і, вядома ж, прафесійныя КВЗшнікі: Віктар Талкач, Аляксандр Гаўрыльчык, Аляксей Міхновіч, Яўген Прус, Дзмітрый Крапчук.

Вынікі сёлетняга розыгрышу "Кубка КВЗ" нікога не здзівілі. У чарговы раз, можна сказаць, па традыцыі, пераможцам стала каманда з шостага інтэрната "Барада Чака Норыса". І той, хто бачыў выступленне хлопцаў, перакананы, што яны сапраўды заслужылі званне галоўных гумарыстаў сярод жыхароў Студгарадка БДУ і нават за яго межамі.

**Юлія ХМЯЛЕЎСКАЯ**

# Літаратурны ПРАМЕНАД

***На сайце газеты "Універсітэт" www.gazeta.bsu.by у 2008 г. праводзіўся паэтычны конкурс "ЛІТАРАТУРНЫ ПРАМЕНАД". Мы дзякуем усім аўтарам за творчы імпэт і ўважлівасць да чытацкіх меркаванняў і запрашаем маладыя таленты да конкурсу ў 2009 г.***

Падводзячы вынікі, нашы эксперты не аддалі абсалютную перавагу ніводнаму аўтару. На іх думку, ёсць цікавыя ідэі і яркія вобразы, але часта кульгае форма (нават не пра мастацтва версіфікацыі або рытміку размова, у многіх з моваю праблемы: хіт сезону – "луна" замест "месяц/поўня/etc", "болГ" – "боль" мужчынскага роду); калі ж роўныя прыгожыя катрэнчыкі, пісаныя нарматыўнай мовай, дык збітыя тэмы і зашмальцаванае паўторамі іх вырашэнне.

Тым не менш, лаўры пераможцаў дасталіся тром аўтарам: Яне САНЬКО (вялікі дзякуй за бродскаўскія інтанацыі "Эміграннцкага вершыка", а яшчэ вось за гэты вобраз: "чарговы дзень,//як карова рабая,//па памяці//да пустога хлява //брыдзе"), Антосю ЮРКАЎЦУ (за яго адзіны, але такі пранізлівы верш) і Сяргею САКУМУ (хаця з мовай яшчэ працаваць, але прынамсі галава і сэрца ў парадку). Да друку мы выбралі ягоны верш "Рыбы пад мостам" (бо паэзія, ды і ўвогуле мастацтва, – гэта акурат пра тое, каб пабачыць у шэрані хваляў гаваркіх рыбак).

Па чытацкай рэакцыі, што прасочвалася па каментарах на сайце газеты, яшчэ адзін пераможца – Станіслаў АНДРОСІК (верш "Канчаткі" займеў найбольш праглядаў з усіх прадстаўленых на конкурс вершаў).

P.S. На пачатку года лаўрэаты будуць запрошаны ў рэдакцыю, каб атрымаць прызы.

***Яна Санько***

### Эміграннцкі вершык

*Горад – капронавае рэшата,*
*а ў ім агнямі мільгае і бліскае*
*такое паралельнае нешта,*
*такое блізкае.*
*Марыя, рыхтуйся, мы адчальваем,*
*засохнім раны, мая адчайная!*
*Гневацца будзем, як тут не змаглі,*
*у іншай, таксама чужой, зямлі.*
*Жменю з сабой, астатняе – іншым*
*мы ім яшчэ лістоў панапішам,*
*мы ім пакажам кузькіну маць!*
*Піжаму? купім! можаш не браць.*
*А горад гладзенькі і красівы*
*слова красівы пращу курсівам*
*дзеці пясок насыпаюць у вёдры*
*я пакідаю ўсё гэта за ксіву.*
*Цяжка быць добрай.*

***Сяргей Сакума***

* * *

*Рыбы пад мостам*
*Блішчаць у шэрані хваляў.*
*Што змяшаліся з шэрым дажджом.*
*А я думаў аптычны падман.*
*А я думаў ніхто не жыве*
*У гэтай бруднай вадзе,*
*Але*
*рыбы пад мостам*
*Блішчаць у шэрані хваляў.*
*Размаўляюць аб чымсьці*
*з белым катом,*
*Рыбакі ідуць берагам.*
*Я заняты чаканнем,*
*Вось ніхто і не ведае, што*
*Рыбы пад мостам.*

***Антось Юркавец***

### Ты

*Мне хочацца абняць цябе*
*Так, як у былыя часы*
*Сваімі слабымі рукамі*
*Праведніка ды пакутніка.*
*Мне хочацца цалаваць цябе*
*Там, дзе фабрычная труба*
*Навісае над рэйкамі*
*І адбіваецца ў лужынах.*
*Мне хочацца даць табе*
*Аплявуху. Такую лёгкую,*
*Як летні лагодны вецер*
*У нашых бясконцых вандроўках.*
*Мне хочацца лыжку супу,*
*Прыгатаванага акурат для мяне*
*Табой, тваімі пяшчотнымі рукамі.*
*Мне хочацца залезці табе*
*Пад спадніцу, чорную і з карункамі,*
*Ды застацца там ваяваць і змагацца.*
*За праўду і справядлівасць,*
*За мілосць і сусветную рэвалюцыю.*
*Я йзноў еду да цябе ў тралейбусе,*
*І ўпэўнены, што кандуктар у сінім*
*Падкажа мне няправільны прыпынак,*
*А міліцыянер у белай кашулі*
*Знойдзе ў маіх кішэнях гераін,*
*Пісталетныя патроны ды яды,*
*Альбо я проста зламаю нагу*
*На слізкай прыступцы твайго пад'езда.*
*Твае вочы зялёныя і глядзяць на мяне*
*Толькі з глянцу фотакартак,*
*Ужо як тры жоўтыя леты*
*Цябе няма*
*І няма рэвалюцыі.*

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР
Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года
17 снежня 2008 года
Падпісана да друку 18.12.2008 г.
Зак. 1448. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by